**Комплекс практыкаванняў для працы над пераказам пры падрыхтоўцы да выніковай атэстацыі па беларускай мове ў 9 класе**

**Алена Валянцінаўна Юшкевіч,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
першай кваліфікацыйнай катэгорыі
сярэдняй школы №41 імя А.М. Кузняцова г. Гродна

**Пры падрыхтоўцы вучняў 9-ых класаў да выпускнога экзамену ў форме пераказу важна захоўваць сістэмнасць і рэгулярнасць падрыхтоўкі. У якасці рабочага матэрыялу варта выкарыстоўваць зборнік матэрыялаў для выпускнога экзамену па вучэбным прадмеце "Беларуская мова" за перыяд навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Кожны тэкст рэкамендавана прааналізаваць на ўзроўні разумення сэнсу і яго інтэрпрэтацыі, лексікі, арфаграфіі, сінтаксісу і пунктуацыі. Прапануем выкарыстоўваць метадычны інструмент "рабочы ліст" і разгледзець комплекс практыкаванняў для падрыхтоўкі да пераказу на прыкладзе экзаменацыйных тэкстаў**

**"Вавёрчына зброя" (стар. 81),**
**"Званы Хатыні" (стар. 136),**
**"Экзамены" (стар. 160).**

**Вавёрчына зброя**

*І са мной размаўляюць звяры і птушкі*
*На дзясятках і тысячах розных моў.*
*У. Караткевіч*

**1. "Чытаем думкі"**

Паразважайце і адкажыце на наступныя пытанні:
– На вашу думку, у тэксце будуць пераважаць элементы апавядання ці апісання?
– Як вы думаеце, пра каго пойдзе гаворка ў тэксце?
– Якую "зброю" прыйдзецца прымяніць вавёрцы і чаму?
– Прачытайце ўважліва тэкст і вызначце яго праблематыку.

**2. "Гарэза"**

– Як вы разумееце значэнне слова "гарэза"? (Пасля адказаў вучняў варта арганізаваць работу з тлумачальным слоўнікам.)
ГАРЭЗА – весялун, дуронік, непаседа.
– Выпішыце з тэксту словы (дзеясловы, прыметнікі), якія характарызуюць вавёрку і раскрываюць значэнне яе імя.

**3. "Геніі арфаграфіі"**

– Запішыце пад дыктоўку ўрывак тэксту ("Маленькая вавёрачка Гарэза…. Звонка перагукваючыся, яны бегалі па лагчыне і шпурлялі ў дрэвы шышкі").

– Растлумачце напісанне наступных слоў: *маленЬкая, нЯдаўна, сЯмейка, салоДкімі, ДЗве, круЦіліся, два маленькІЯ чалавечкІ, лаГчыне.*
– Выпішыце з тэксту сем – дзесяць слоў, якія выклікаюць у вас складанасці пры напісанні. Падрыхтуйце слоўнікавы дыктант для аднакласнікаў.

**4. “Вавёрчына зброя”**

– Перачытайце тэкст яшчэ раз. Складзіце план тэксту. Падрыхтуйце тэкставы кадраплан.

## Званы Хатыні

*Не патрэбна ніякаму часу вайна!*
*Не патрэбна і нашаму веку!*
*Л.Воранава.*

**1. “Пытанні-актывізатары”**

– Успомніце, якія гістарычныя факты, звязаныя з трагічнымі падзеямі ў Хатыні, вам вядомыя.
– Што вам вядома пра сучасны мемарыяльны комплекс “Хатынь”?
– Ці былі вы ў гэтым мемарыяльным комплексе?

**2. “Знаёмства з тэкстам”**

– Уважліва прачытайце тэкст.
– Ці сустрэліся вам у гэтым тэксце словы, значэнне якіх вы не ведаеце?
______________________________________________________________
______________________________________________________________
______________________________________________________________
__________________________________________________________

– Складзіце цытатны план тэксту.
______________________________________________________________
______________________________________________________________
___________________________________________________________

**3. “Пазл”**

Узнавіце прапушчаныя словы, спалучэнні слоў у сказах.

| | |
|---|---|
| 1)Бясконцы … паток. | ля вянка |
| 2)Моўчкі стаяць людзі .. … памяці, пакладзенага на месца пахавання попелу … . | хатынцаў |
| 3)Кранае душу іх просьба – увекавечыць … і … на Зямлі, каб нідзе і ніколі ў віхуры пажараў не ўмірала жыццё. | людскі<br>абараняць<br><br>беларускага народа |
| 4)Хатынь жыве не толькі ў народнай памяці, але і штодзённых справах … … . | мір і спакой |
| 5)У наш жорсткі час | |

NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

| | |
|---|---|
| недастаткова любіць мір – трэба ўмець яго … . | |

**4.“Выправі памылкі”**

У прыведзеным урыўку з тэксту неабходна знайсці арфаграфічныя памылкі і выправіць іх.

З дня аткрыцця мемарыала тысячы людей пабывалі у Хатыні, але люцкі паток да гэтага свяшчэннага месцца не спыняецца ніколі. Сюды ідуць тыя, хто быў асуджанны нямецкім фашызмам на смерць, але на перакор ўсяму нарадіўся і жыве. Сюды прыяжджаюць многія людзі з Захаду і Ўсходу, якім вельмі хочацца зразумець, чаму мы не толькі выстаялі, але і перамаглі у гэтай вайне.

**5.“Шпаргалка”**

Вучням прапануецца сціснуць тэкст да фармата шпаргалкі (*перадаць яго змест з дапамогай сціслых тэзісаў, малюнкаў, умоўных абазначэнняў, асобных слоў з тэксту*).

Работа выконваецца ў парах. Затым з дапамогай шпаргалкі кожны вучань расказвае тэкст свайму суседу па парце.

### Экзамены

*Дзівосны свет – сам чалавек*
*З яго душой, любоўю, справамі…*
*В.Жуковіч*

**1. Памятка “Як напісаць пераказ? 9 карысных парад!”**

Вучні знаёмяцца з памяткай, аналізуючы яе пункты.

**2. “Прастакутнік”**

– Прачытайце тэкст. Запоўніце грані прастакутніка па асноўных паняццях, неабходных для першаснага аналізу тэксту.

<table>
<tr><td colspan="5">ТЭМА</td></tr>
<tr><td colspan="5"></td></tr>
<tr><td>СТЫЛЬ</td><td></td><td>“ЭКЗАМЕНЫ”</td><td></td><td>ТЫП</td></tr>
<tr><td colspan="5"></td></tr>
<tr><td colspan="5">ІДЭЯ</td></tr>
</table>

**3. “Інтэлектуалы”**

– Складзіце пяць пытанняў па тэксце, якія будуць пачынацца са слоў “Што?”, “Дзе?”, “Калі?”, “Чаму?”, “Як?”, і задайце гэтыя пытанні сваім аднакласнікам.

*Узор: Што атрымаў Лабановіч? Дзе стаяў Лабановіч, як зачараваны? Чаму Лабановіч стаяў, як зачараваны? і г.д.*

NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

**4. “Карэктар”**

– Выпраўце арфаграфічныя і пунктуацыйныя памылкі, дапушчаныя вучнямі на экзамене.

Лабановіч стаяу каля рашчыненнага акна. Штосці прыемнае і радастнае западала ему ў душу ад тых новых малюнкав і ад гэтага размашыстага бегу машыны. Хутка адыходіла назат станція з высокай водакачкай закрываючыся свежэй зеленю раслін. Расыпаючы сноп залатых стрэл велічна выплывала солнца з за края землі над прасторамі зелёнага палесскага мора. Хутка з’яўляліся і знікалі усё новые і новыя малюнкі гэтага зачараваннага краю. Балоты канчаліcь, каля дарогі уставалі высокія стены бору які перасякаўся весёлымі палянкамі. Там сям віднеліся на іх люцкія будынкі, а бярвені гэтых будынкаў, асветленныя солнцам здаваліся маршчынамі на разумным твары чалавека які многа думаець і разважае. Вясёлыя палянкі акружалі пышна зялёныя хвойнікі на жоуценкім пясочку. А як прыгожа вілялі і беглі ў хвойніку каляінкі вясковых дарожак і стежак па якіх так рэдка праяжджаў сялянскі воз! Вельмі родным, мілым, даўно знаёмым веяла ад аксамітных абрысаў маладога жыта і ад кволых бледна вясёлых ўсходаў раніх аўсоў.

**5. “Тэатр”**

– Прачытайце па ролях урывак тэксту *(“Лабановіч стаяў каля акна, як зачараваны….. – Цельшынская школа”).*

– Падрыхтуйце ісцэніроўку гэтай часткі тэксту.

*Ролі:* Лабановіч, вучні, аўтар, хтосьці ў школе.

*Месца дзеяння і атрыбуты:* цягнік, каля акна, станцыя, школа, званок, дзверы.

!Можна загадзя падабраць неабходныя атрыбуты.

## Літаратура

Зборнік матэрыялаў для выпускнога экзамену па вучэбным прадмеце “Беларуская мова” за перыяд навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі: тэксты для пераказаў. – Мінск : Акадэмія адукацыі, 2025. – 207 с.

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА